4. Музей Финансового университета [Электронный ресурс] // Финансовый университет при Правительстве Российской Федерации. – Режим доступа: http://www.fa.ru/org/div/museum/Pages/About.aspx. – Дата доступа: 11.04.2024.
5. Телеграмм-канал военно-патриотического движения Финансового университета [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://t.me/s/vpdfinun. – Дата доступа : 11.04.2024.

*В. А. Максімовіч, доктар філалагічных навук, прафесар*
*Інстытут філасофіі НАН Беларусі, г. Мінск*

# РОЛЯ ЛІТАРАТУРЫ Ў ПАТРЫЯТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ СУЧАСНАЙ МОЛАДЗІ

Стратэгічная задача ідэйна-выхаваўчай работы сярод моладзі перадусім звязана з фарміраванне сістэмы каштоўнасцей і каштоўнасных установак, заснаваных на патрыятызме, грамадзянскасці, сацыяльнай актыўнасці, калектывізме, законнасці, справядлівасці і маральнасці. Гэты працэс прадугледжвае і актыўнае засваенне духоўных атрыбутаў як гістарычнага мінулага, так і сучаснасці, што спрыяе захаванню ментальнага, духоўнага свету сучаснага маладога чалавека, умацаваню яго ідэйных перакананняў, светапогляднай пазіцыі, маральных якасцей, актыўнай светапогляднай пазіцыі.

Вялікая роля ў патрыятачным выхаванні моладзі належыць беларускай літаратуры, якая спрыяе мэтанакіраванаму фарміраванню каштоўнаснай, эстэтычнай свядомасці, самарэгуляцыі ўласнага ўнутранага свету, што, у сваю чаргу, служыць фундаментальнай інтэграцыі ўсебаковых здольнасцей, актывізацыі творчай дамінанты асобы. Творчае засваенне літаратурных артэфактаў азначае перш за ўсё стаўленне да іх не як да догмы, а як да адкрытай, варыятыўнай сістэмы пошуку аксіялагічных асноў, у тым ліку адрэфлексаваці асобасных сэнсаў. Засваенне комплексу каштоўнасцей, уяўленняў, нормаў і прынцыпаў жыццядзейнасці з’яўляецца ў дадзеным выпадку вынікам культывавання адпаведных духоўных ідэалаў, патэрнаў, якія ўяўляюць сабой своеасаблівую квінтэсенцыю як агульначалавечых, так і нацыянальных каштоўнасцей.

Беларуская літаратура вылучаецца сваім моцным патрыятычным пафасам, услаўленнем вечных каштоўнасцей, роднай зямлі. Шмат хто з сучасных паэтаў – выхадцы з вясковага, сялянскага асяроддзя, з жытнёвага роду, продкі якіх звязалі свой лёс з зямлёю, з прыродай, з традыцыйным укладам жыцця. Вясковая стыхія сфарміравала іх светапогляд, іх духоўныя якасці, навучыла быць назіральнымі, дапытлівымі, эмацыянальна чулымі, тонкаадчувальнымі, суперажывальнымі. Вось чаму іх вершы ўвабралі ў сябе непаўторныя фарбы і гукі роднай зямлі, прыгажосць і непаўторнасць мілых сэрцу краявідаў, сфарміравалі па-сапраўднаму абагаўлёныя адносіны да ўсяго роднага, крэўнага, спаконвечнага.

Асаблівая, сакральная прывязанасць да роднай зямлі – у нашай генетычнай памяці, у нашай крыві. Так ужо сталася адвеку, што Радзіма для нас – гэта тая зямля, што цябе ўзгадавала, бацькоўская хата, блізкія і дарагія людзі, мілыя і любыя сэрцу краявіды. Менавіта глыбіннае, сакральнае пачуццё Радзімы складае падмурак нацыянальнай самасвядомасці, нацыянальнага пачуцця, умацоўвае спадчынныя карані, тую генетычную повязь-яднанне, што дазваляе напоўніцу пачувацца адзінай супольнасцю людзей – народам, нацыяй. Толькі яно, святое пачуццё Радзімы, дае адчуць трывалы грунт пад нагамі, тую аснову, на якой здаўна трымаецца жыццё, спаконвечнае адчуванне радзіннасці, адзінакрэўнасці, людскасці.

Радзіма – гэта яшчэ і веданне гісторыі менавіта гэтага кавалачка зямлі, яго паданняў, паходжання яго назваў, дасціпных і павучальных здарэнняў з удзелам тваіх землякоў, лёсаў гэтых людзей. З такога ведання нараджаецца гонар – яшчэ адзін надзвычай важны складнік любові да роднай зямлі. Без гэтага няма чалавека. Без гэтага нельга адчуць даастатку сваё сапраўднае зямное пакліканне, сваю прыналежнасць-далучанасць да таго шчымліва-прасветлага, жыццядайнага, жыццяабярэжнага, што заключана ў слове Радзіма.

Агульнавядома, што наша айчынная літаратура вылучаецца сваёй арганічнай, глыбіннай сувяззю з народнымі вытокамі, з прыродай, з жывымі праявамі рэчаіснасці. Асаблівую замілаванасць да свайго роднага кута, зялёных гоняў, шумнаспеўных гаёў і дубраў дэманструе беларуская паэзія, якая вызначаецца разнастайнасцю тэматыкі, багаццем зместу і яркасцю мастацкіх вобразаў. Наша паэзія, па прызнанні даследчыкаў літаратуры, – самая зямная, прыродная, жыццесцвярджальная. Бо людзі

беларускага краю вядомыя сваёй шчырай любоўю і прыхільнасцю да дзедавых сядзіб, да родных «вербаў і бяроз». Яны здаўна імкнуліся жыць у гармоніі з прыродай, з яе цудадзейнай і самавітай красой, наталялі сваю душу водарам пахучых траў і пахам лугавых кветак. Усваім вершы “Зямля мая” я імкнуўся як мага найглыбей і найпаўней выказаць сваю замілаванасць роднымі краявідамі, з вялікай пачуццёвасцю прамаўляю шчырыя словы прызнання, наўпрост абагаўляю святы і непаўторны куточак зямлі:

Зямля мая – мой звонкаспеўны край,
Стятая жыватворная крыніца!
Вяртаюся сюды, нібыта ў рай,
Каб ля святых вытокаў памаліцца;

Вачмі лугі аблашчыць і палі,
Падлесак мой, што дружна ў рост пусціўся,
Сцяжынкі тыя, што ў жыццё вялі,
Каб не зблудзіў, са шляху каб не збіўся.
………………………………………………………
О краю мой – святляны, дарагі,
Прытулак жыццяспеўны, жыццядайны!
Ты лечыш ад самоты і тугі,
Ад нематы і немачы адчайнай.

Табе сыноўскі нізкі мой паклон,
Табе мая бязмежная удзячнасць
За несціханы ў сэрцы перазвон,
Душой адчутую радзімы значнасць.

Я веру, калі стане золка мне
Ад ветру злога, сцюжы і завеі, –
Мая зямля, бы маці, прыхіне
І, як ніхто на свеце, зразумее.

Таму я зноў вяртаюся сюды,
Да родных ніў, да звонкай той крыніцы –
Святой і жыватворнае вады, –
Вячыстай прыгажосцю прычасціцца [1, с. 10–11].

Патрыятызм – адна са складаючых маральнага выхавання. Чалавек, у якім развіта пачуццё любові, спагадлівасці, які беражліва адносіцца да прыроды, да ўсяго жывога на зямлі, ніколі не зможа здзейсніць амаральны ўчынак, быць агрэсіўным, нецярплівым, бяздушным. Наадварот, ён не дасць у крыўду малодшага за сябе, не дасць прапасці птушцы ці любой жывой істоце, якая трапіла ў бяду, а будзе жыць у згодзе і ладзе з усім на зямлі. І ўсяму гэтаму вучыць літаратура, мастацкае слова, якое ў першую чаргу звернута да чалавека, да яго душы і сэрца, да людской памяці, сумленнасці. Літаратура вучыць дабру і праўдзе, вучыць быць сапраўднымі грамадзянамі сваёй краіны, нераўнадушнымі і неабыякавымі да ўсяго, што адбываецца ў жыцці.

Як і кожнае сапраўднае, глыбіннае пачуццё, любоў да Радзімы патрабуе велізарных духоўных і фізічных высілкаў, унутранай праца душы, неймавернага самапаглыблення, самарэфлексіі, што, у выніку, спрыяе раскрыццю самых шчырых, самых пранікнёных пачуццяў. І такое пачуццё ўласціва перадусім творцу – чалавеку тонкай, уражлівай, балючай і чулай душы.

Мая Айчына! Беларусь мая!
Прасветлы кут, навекі блаславёны! –
Цябе сардэчна зноў вітаю я –
Прачула, задушэўна, пранікнёна.

Куды б мяне дарогі ні вялі,
Не здраджвае ніколі адчуванне,

Што тут, на гэтай любаснай зямлі,
Прытулак мой, і лёс мой, і прызванне;
…………………………………………
О, Бацькаўшчына любая мая!
Я твой гаючы водар удыхаю,
І цешуся тваёй раскошай я,
І кожнай жылкай у цябе ўрастаю [1, с. 27].

На вялікі жаль, у наш спажывецкі час любоў да Радзімы, нацыянальныя і агульначалавечыя каштоўнасці, культываемыя здаўна нашымі продкамі, патрыятычныя пачуцці ўвогуле спакваля пачынаюць дэвальвавацца, пераходзіць у разрад другасных. А такога не павінна быць! Гэта вельмі небяспечная, пагражальная тэндэнцыя, з якой ніякім чынам нельга мірыцца, бо, у адваротным выпадку, можа наступіць смерць духоўная, аняменне душы. Пазбаўлены магчымасці атрымліваць асалоду ад судакранання з каранёвым, спадчынным, чалавек можа страціць здольнасць быць арганічнай часцінкай вечнажывой прыроды. У родным – выратаванне, у родным – збавенне, у родным – крыніца ўзбагачэння духоўнай скарбніцы, духоўнай моцы. Як тут не прыгадаць словы Я.Коласа з паэмы «Новая зямля», дзе малітоўна гучыць услаўленне зямлі як вечнажывога дару, найкаштоўнейшага скарбу:

Зямля не зменіць і не здрадзіць,
Зямля паможа і дарадзіць,
Зямля дасць волі, дасць і сілы,
Зямля паслужыць да магілы,
Зямля дзяцей тваіх не кіне,
Зямля – аснова ўсёй айчыне [2, с. 235].

Ва ўсе часы беларусы шанавалі спадчыну продкаў, зберагалі родавую памяць, культывавалі беражлівае, замілаванае, ушанавальнае стаўленне да свайго роднага кута, сваіх першародных крыніц. Гэтая традыцыя аказалася выключна жыццястойкай. Падобныя адносіны абумоўлены як прыродна-ландшафтнымі, так і геапалітычнымі, гістарычнымі акалічнасцямі. Даволі часта нашым продкам выпадала перажываць пакручастыя, віхурыстыя часы, жыць і выжываць у неймаверна цяжкіх, невыносных умовах, многім ахвяраваць. Але, нягледзячы ні на што, яны цвёрда былі ўпэўнены ў адным: каб застацца, каб захаваць сябе, патрэбна трымацца сваіх каранёў, свайго радзінна-спадчыннага котлішча. Менавіта ў такія лёсавызначальныя часы, калі ўзнікала пагроза фізічнага знішчэння, анямення, шматкроць узрастала адчуванне духоўнай еднасці, супольнасці, чалавечай і нацыянальнай роднасці, зямляцтва. Тое ж мы можам назіраць і сёння, калі ўзнікла пагроза знікнення роднай мовы. Недзе на ўзроўні падсвядомага міжволі ўзнікае своеасаблівы абарончы рэфлекс, неадольнае жаданне перашкодзіць таму, прадухіліць непажаданыя наступствы, не даць сысці ў нябыт матчынай мове, на якой можна душэўна паразумецца, адчуць чалавечую дабрыню і, па словах Сяргея Грахоўскага, «мінаючы прорвы і спады, / Узбірацца на стромкія грэбні».

Кожны паэт імкнецца засведчыць высокаграмадзянскае адчуванне адказнасці за сваю спадчыну, свой родавы куточак, усведамляе ні з чым не параўнаную гордасць за сваю радзіму, за яе таленавітых і самаадданых людзей, клапоціцца за пераемнасць і працяг нацыянальных традыцый. Па-сапраўднаму адчуваеш сябе нашчадкам магутнага, непераможнага племені-роду, чытаючы тыя ж рамантычна-ўзнёслыя караткевічаўскія радкі:

Дзе мой край!
Там, дзе людзі ніколі не будуць рабамі,
Што за паліўку носяць ярмо ў безнадзейнай турме,
Дзе асілкі-хлапцы маладымі ўзрастаюць дубамі,
А мужчыны як скалы – ударыш, і зломіцца меч [3, с. 136].

Вершы, прысваныя роднаму краю, у кожнага з беларускіх паэтаў вылучаюцца асаблівым лірычным пачуццём, эмацыянальнай узрушанасцю, шчырасцю і непасрэднасцю. Яскрава заўважаецца свой адметны падыход да раскрыцця тэмы, свой почырк, асаблівае стаўленне да ўсяго перажытага, выпакутаванага, прапушчанага праз уласнае сэрца. Уласна, тэма радзімы раскрываецца ў самых розных праблемных аспектах і жанрава-стылявых падыходах, уключаючы пейзажную і філасофскую

канву, лірычную рэфлексію і грамадзянскую дыдактыку з ужываннем шматлікіх тропаў і стылістычных фігур.

З барвяных грозных сечаў векавых,
З узрушных громаў і калянай стыні,
Што гартавалі горды дух жывы,
Паўсталі вы, зямлі маёй святыні.

Скрозь сцюжнасць адзічэлай нематы,
Адрынуўшы зняможную згібеласць,
Мая Айчына, моцай ўздужнай ты
Ў вяках суровых выстаяць здалела,
……………………………………………
Варожны стан не здолеў раз'яднаць
Нас хцівай меркаю сваёй памежнай, —
Сям'ёй адзінай прагнулі мы стаць,
Жыць у дзяржаве вольнай, незалежнай.

Нашчадкі абаронцаў-ваяроў,
Тваю, Айчына, славім неўміручасць
І наталяем смагу зноў і зноў
Тваёй бруёй вячыстай і гаючай.
…………………………………………..
У скрутах дзён ніколі не згасіць
Надзею, што непадуладна скрусе:
Айчына-маці вечна будзе жыць
У сэрцах моцных духам беларусаў! [4, с. 8].

Вершы беларускіх паэтаў – ад класікаў да сучаснікаў – пераканаўча дэманструюць свой гуманны патэнцыял, сваю жыццясцвярджальна-патрыятычную скіраванасць. Бо кожны з іх адчувае сваю арганічную, жывую повязь з глыбінна нацыянальным, сакральным і прыкладае шмат намаганняў дзеля захавання родавай памяці, дзеля ўслаўлення і зберажэння гісторыка-культурнай спадчыны, нацыянальных сімвалаў, самой ідэі беларускасці. І гэта робіцца ў імя захавання нацыянальнага пачуцця, што заклікана ўмацоўваць наш дух, нашу веру, наша сакраментальнае жаданне пачуваць сябе адзінакрэўцамі, братамі і сёстрамі, руплівымі будзіцелямі і годнымі спадкаемцамі славы сваіх бацькоў і дзядоў, – каб быць беларусамі, каб не згубіць сябе ў свеце.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Максімовіч, В. А. Пакуль шыпшына квеценню гарыць : вершы і паэма / В. А. Максімовіч. – Мінск : Права і эканоміка, 2019. – 180 с.
2. Колас, Я. Збор твораў : у 20 т. / Я. Колас ; рэд. тома М. І. Мушынскі ; падрыхт. тэкстаў і камент. Э. А. Золавай ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я .Коласа і Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – Т.8. Паэма «Новая зямля». – 347 с.
3. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч ; аўт. прадм. В.Быкаў. – Мінск : Маст. літ., 1987. – Т.1. Вершы, паэмы. – 431 с.
4. Максімовіч, В. Шляхам яднання / В. Максімовіч // Літаратура і мастацтва. – 2023. – 13 кастрычніка. – С. 8.